ТАА «Інстытут рознічных тэхналогій “Менка”»
Цэнтр вывучэння гісторыі гандлю

# Працы Цэнтра вывучэння гісторыі гандлю

выпуск **1**

Мінск
«Тэхналогія»
2015

УДК 339.1(476)(082)

Зборнік заснаваны ў 2015 г.

Першы выпуск Працаў Цэнтра вывучэння гісторыі гандлю ўтрымлівае матэрыялы міжнароднага семінара «Крыніцы гісторыі рознічнага гандлю ў Беларусі» (Мінск, 11.10.2014), якія адлюстроўваюць стан крыніцазнаўчай базы па гісторыі гандлю ў Беларусі і магчымасці архіўных збораў для вывучэння дадзенай тэмы, а таксама навуковыя артыкулы сяброў Цэнтра, прысвечаныя гісторыі гандлю ў Беларусі.

Рэдакцыйная калегія:
*Юрась Бохан, Рацібор Бягун (адказны сакратар), Андрэй Кіштымаў,*
*Мікалай Крывальцэвіч, Ларыса Лазарэвіч, Ірына Раманава, Генадзь Рыдзеўскі,*
*Іна Соркіна, Вячаслаў Швед, Захар Шыбека (адказны рэдактар)*

Рэцэнзенты:
*Анатоль Люты,* доктар гістарычных навук,
*Эдуард Савіцкі,* доктар гістарычных навук

**ISBN 978-985-458-265-8**

© ТАА «Інстытут рознічных тэхналогій “Менка”», 2015.
© Афармленне. НВК «Тэхналогія», 2015.

## ЗМЕСТ

## Content


Прадмова . . . . . . . . . . 5
*Preface*

**I. Архівы**
***Archives***

*Эдуард Савицкий.* Источники истории торговли в государственных архивах Республики Беларусь . . . . . . . . . . 7
*Eduard Savicki.* The sources of the history of trade in the state archives of the Republic of Belarus

*Мікалай Нікалаеў.* Матэрыялы пра гандаль дасавецкай Беларусі ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбурзе . . . . . . . . . . 17
*Mikalaj Nikalajeŭ.* Documents in the Russian State Historical Archive, St. Petersburg, about trade in pre-Soviet Belarus

**II. Крыніцы**
***Sources***

*Мікалай Крывальцэвіч.* Абмен у першабытныя часы на землях Беларусі: крыніцазнаўчыя і гістарыяграфічныя аспекты . . . . . . . . . . 29
*Mikalaj Kryvalcevič.* Exchange in primitive times in the lands of Belarus: source study and historiographical aspects

*Захар Шыбека.* Габрэйскі гандаль на беларускіх землях у дакументах па гісторыі габрэяў ад канца XIV да XIX стагоддзя, выдадзеных у Расіі ў 1882–1918 гадах . . . . . 38
*Zachar Šybieka.* Jewish trade on the territory of Belarus in the documents on the history of the Jews in the end of XIV – XIX century published in Russia in 1882–1918

*Эмануил Иоффе.* К вопросу об источниковедении истории еврейской торговли в Беларуси (конец XIV – начало XX века) . . . . . . . . . . 52
*Emanuil Iofe.* On the issue of source study of history of Jewish trade in Belarus (late XIV – early XX century)

*Вячаслаў Швед.* Тыпалогія крыніц па гісторыі кірмашоў Беларусі (1772–1861 гады) . . . 58
*Viačaslaŭ Švied.* The typology of sources on the history of fairs in Belarus in 1772–1861

*Сяргей Сергачоў.* Крыніцы для вывучэння архітэктуры будынкаў гандлю і сферы паслуг у Беларусі (1772–1917 гады) . . . . . . . . . . 63
*Siarhiej Sierhačoŭ.* Sources for the study of architecture of buildings for trade and services in Belarus in 1772–1917

*Людмила Баюра, Александр Баюра.* Почтовые открытки как источник изучения истории розничной торговли в Беларуси в конце XIX – первой половине XX века . . . . . . 69
*Liudmila and Aliaksandr Bajura.* Postcards as a source of studying the history of retail trade in Belarus in the end of XIX – the first half of XX century

*Аляксандр Бурачонак.* «Обзоры губерний» як крыніцы вывучэння рознічнага гандлю Беларусі ў складзе Расійскай імперыі . . . . . . . . . . 72

*Aliaksandr Buračonak.* «Provinces reviews» as a source of studying retail trade of Belarus in the Russian Empire

*Валянціна Лебедзева.* Характарыстыка крыніц для вывучэння гандлёва-эканамічных дачыненняў у Беларусі пад час войнаў 1914–1920 гадоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
*Valiancina Liebiedzieva.* Features of the sources for studying trade and economic relations in Belarus during the wars in 1914–1920

*Вольга Волкава.* Крыніцы па гісторыі рознічнага гандлю Беларусі перыяду нямецкай акупацыі пад час Першай сусветнай вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
*Voĺha Volkava.* Historical sources on retail trade in Belarus during German occupation in World War I

*Андрэй Чарнякевіч.* Крыніцы пра гандаль на тэрыторыі Генеральнага камісарыята ўсходніх земляў у 1919–1920 гады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
*Andrej Čarniakievič.* Sources about trade on the territory of the General Commissariat of the eastern lands in 1919–1920

*Елена Сумко.* Советская розничная торговля БССР второй половины 1940-х годов, отраженная в фондах Национального архива Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . 102
*Aliena Sumko.* Soviet retail trade of the BSSR in the second half of the 1940s reflected in the funds of the National Archives of the Republic of Belarus

*Васіль Матох.* Рознічны гандаль у Беларусі ў час нацысцкай акупацыі (1941–1944 гады). Агляд літаратуры і крыніц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
*Vasiĺ Matoch.* Retail trade in Belarus during Nazi occupation in 1941–1944. Review of literature and sources

*Геннадий Ридевский.* Статистические материалы как источник изучения розничной торговли в современной Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
*Hienadź Rydzieŭski.* Statistical materials as a source of retail trade study in modern Belarus

**III. Даследаванні**

***Researches***

*Владимир Заремский.* Почтовые станции в 1772–1914 годах: зарождение придорожного сервиса в белорусских землях . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
*Uladzimir Zaremski.* Postal stations in 1772–1914: birth of roadside service in Belarusian lands

*Вольга Сабалеўская.* Габрэі-гандляры ў гаспадарчай сістэме Нясвіжскага замка Радзівілаў (канец XVIII – пачатак XIX стагоддзя) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
*Voĺha Sabalieŭskaja.* Jewish merchants in the economic system of the Radziwill family's Nesvizh Castle (late XVIII – early XIX century)

*Наталья Ковалева, Людмила Малыхина.* Развитие внутренней торговли в западнобелорусском регионе России (1861–1914 года) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
*Natallia Kavaliova, Liudmila Malychina.* The development of internal trade in the Western Belarus region of Russiain 1861–1914

*Татьяна Буевич, Анна Люсева.* Формирование розничной торговой сети Витебска на этапе становления советского государства и в период НЭПа с конца 1917 года по 1931 год (По материалам Государственного архива Витебской области) . . . . . . . . 158
*Tacciana Bujevič, Hanna Liusieva.* Formation of retail networkin Vitebsk at the stage of Soviet state formation and during NEP period from late 1917 till 1931 (According to the State Archives of Vitebsk Region)

*Татьяна Буевич.* Предприятия розничной торговли Витебска в 1930-е годы: от потребительской кооперации к государственной торговле (По материалам Государственного архива Витебской области) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169
*Tacciana Bujevič.* Retail enterprises of Vitebsk in the 1930s: from consumer cooperation to state trade (According to the State Archives of Vitebsk Region)

Звесткі пра аўтараў *(Information about the authors)* . . . . . . . . . . . . . . . . . 181

## ПРАДМОВА

Цэнтр вывучэння гісторыі гандлю пры беларускай кампаніі «Менка» пачынае перыядычнае выданне навуковых працаў сваіх сяброў і ўсіх навукоўцаў, якія вывучаюць гістарычны вопыт гандлёвай дзейнасці на беларускіх землях. Зацікаўленаму чытачу прапануецца першы выпуск «Працаў Цэнтра». Плануецца, што гэта выданне зробіцца перыядычным. У працаўнікоў навукі з'яўляецца магчымасць сістэматычна публікаваць вынікі сваіх даследаванняў гісторыі гандлю.

У першым выпуску асноўнае месца адводзіцца матэрыялам семінара «Крыніцы гісторыі рознічнага гандлю ў Беларусі», які праводзіўся 11 кастрычніка 2014 г. у Мінску кампаніяй «Менка» і Цэнтрам вывучэння гісторыі гандлю ў мэтах паспяховай рэалізацыі навуковага праекта па напісанню калектыўнай манаграфіі «Гісторыя рознічнага гандлю ў Беларусі». Сярод удзельнікаў былі аўтары будучай манаграфіі, эксперты па архіўных крыніцах і некаторыя даследнікі, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у семінары.

Вядома, што значная частка архіўных гістарычных крыніц (рукапісных і друкаваных), а таксама кніжнага фонду і старых камплектаў газет Беларусі была вывезена за межы краіны або загінула ў часы бесперапынных войнаў на беларускіх землях. Выяўленне ж страчаных дакументальных каштоўнасцей, іх рэстытуцыя і маштабнае капіяванне на дзяржаўным узроўні не наладжаны. У Беларусі не існуе друкаваных зборнікаў архіўных дакументаў, спецыяльна прысвечаных гісторыі гандлю. У беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць крыніцазнаўчыя працы па гісторыі гандлю. У выніку перад беларускімі даследнікамі гісторыі развіцця «розніцы» паўстаюць складаныя задачы: 1) самім ажыццяўляць пошук і выяўленне адпаведных крыніц, у тым ліку і за межамі краіны, 2) вельмі старанна «дапытваць» тыя крыніцы інфармацыі, якія захаваліся ў Беларусі, а для таго вынаходзіць свае прыёмы і метады.

Працы ўдзельнікаў семінара сведчаць, што яны выявілі крыніцы па гісторыі рознічнага гандлю Беларусі, вызначылі іх інфарматыўную вартасць і часткова правялі крытычны аналіз. Гэта якраз тое, што можна было зрабіць на першым этапе даследавання. Наступны этап больш глыбокага вывучэння крыніц звязаны з непасрэдным напісаннем навуковых тэкстаў і вырашэннем тых канкрэтных задач, якія ставяць перад сабой аўтары.

Таму зусім натуральна, што ў гэтым выданні адлюстраваны вынікі першапачатковага этапу даследавання крыніц пра гандлёвую дзейнасць на беларускіх землях. Варта падкрэсліць, што раней такога мэтанакіраванага вывучэння не праводзілася. Першы выпуск «Працаў Цэнтра» стаў адначасова і першым у беларускай гістарыяграфіі навуковым выданнем крыніцазнаўчых працаў, прысвечаных праблемам гандлю.

Пачынаюцца «Працы» з раздзела «Архівы», у якім размешчаны архівазнаўчыя артыкулы. Крыніцазнаўчыя працы сабраны ў раздзеле «Крыніцы» і размешчаны ў храналагічным парадку: ад першых праяваў тавараабмену ў каменным веку да сучаснасці. У складзе гэтага раздзела некаторыя аўтары праводзяць крыніцазнаўчы аналіз на фоне праблем гістарыяграфіі. Акрамя таго, выданне мае раздзел «Даследаванні». У яго ўлучаны артыкулы, аўтары якіх вывучалі практыкі гандлёвай дзейнасці на аснове шырокай базы крыніц, а таму іх творы таксама маюць крыніцазнаўчую вартасць. Артыкулы апошняга раздзела таксама размешчаны ў храналагічным парадку: ад канца XVIII ст. да 1930-х гг.

Дадзенае выданне будзе карысным для ўсіх тых, хто вывучае гісторыю беларускай эканомікі і беларускага прадпрымальніцтва.

Арганізатары семінара выказваюць удзячнасць усім аўтарам першага выпуску «Працаў Цэнтра», а зацікаўленых чытачоў просяць дасылаць свае заўвагі і пажаданні на электронны адрас Цэнтра вывучэння гісторыі гандлю кампаніі «Менка» – history@menka.by, або выказацца на яго форуме – http://forum.menka.by/.

*Рэдкалегія*